■ Жыллё маё

# «КАМЕНЬ СПАТЫКНЕННЯ» Ў БУДАЎНІЦТВЕ — ІНФЛЯЦЫЯ

**Аб'ёмы будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай, а таксама стварэнне сістэмы жыллёвых накапленняў будуць залежаць ад стабільнасці беларускага рубля. Пра гэта журналістам паведаміў міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль ЧОРНЫ. Паводле яго слоў, сёння не ідзе гаворкі аб тым, каб налета павялічыць аб'ёмы будаўніцтва жылля з падтрымкай дзяржавы.**

«Наша галоўная задача — захаваць такія ж аб'ёмы, як сёлета, — зазначыў міністр. — Трэба на 100 працэнтаў забяспечыць жыллём шматдзетныя сем'і, і гэта цяпер робіцца. У асноўным, гэта катэгорыя грамадзян чакае кватэры не больш за год, у тым ліку і ў Мінску».

Па словах Анатоля Чорнага, галоўнай праблемай застаецца памер інфляцыі, які не дазваляе сур'ёзна павысіць аб'ёмы будаўніцтва з дзяржпадтрымкай для грамадзян, што маюць патрэбу ў жыллі. Калі зніжэнне курса беларускага рубля будзе складаць не больш, чым 10 працэнтаў за год, можна будзе разглядаць пытанне аб павелічэнні такога субсідавання. Гэты ж паказчык стане вызначальным і для стварэння ў Беларусі сістэмы будаўнічых накапленняў. Мяркуецца, што пасля стварэння гэтага механізм будзе даступны для ўсіх катэгорый грамадзян.

За мінулае паўгоддзе ў краіне было ўзведзена 2 мільёны 54 тысячы квадратных метраў жылля пры заданні ў 1 мільён 200 тысяч квадратных метраў. Гэта 52% ад гадавога плана. З іх 505,8 тысячы было пабудавана з дзяржпадтрымкай (гадавы план складае 840 тысяч квадратных метраў). Таму, на думку Анатоля Чорнага, усе задачы на год будуць выканания. Кошт квадратнага метра склаў 750 рублёў, і гэта таксама ніжэй за запланаваны гадавы паказчык у 790 рублёў.

Пытанне аб аб'ёмах жыллёвага будаўніцтва на 2017 год пакуль разглядаецца, але можна дакладна сказаць, што яны не будуць меншымі за 3 мільёны 500 тысяч квадратных метраў (сёлета гадавы план складае 4 мільёны квадратных метраў). У першую чаргу зніжэнне абумоўлена кольказцю зваротных сродкаў, за якія будуецца жыллё з дзяржпадтрымкай — цяпер іх хопіць толькі на пабудову 300 тысяч квадратных метраў жылля (для параўнання — сёлета плануецца ўзвесці 840 тысяч). Аб'ёмы камерцыйнага ж будаўніцтва застаюцца ранейшымі. Аднак пры распрацоўцы бюджэту міністэрства па даручэнні прэм'ер-міністра будзе настойваць на павелічэнні дзяржаўнай падтрымкі, таму лічба ў 3,5 мільёна квадратных метраў пакуль неканчатковая.

Закранаўся і пытанне арэндных кватэр — іх сёлета пабудавана каля 100 тысяч квадратных метраў. На 2017 год запланавана стварэнне 130 тысяч арэндных квадратных метраў, у тым ліку і ў сталіцы. Дарэчы, аб'ёмы будаўніцтва ў Мінску, па словах міністра, будуць зніжацца. Як паведаміў Анатоль Чорны, «максімальны аб'ём жылля, які мы можам узвесці ў сталіцы, з улікам усіх зносаў і ўшчыльненняў, складае 7 мільёнаў квадратных метраў».

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Збіраем ранец

# РАСКЛАД ШКОЛЬНЫХ КІРМАШОЎ

**На спецыялізаваных выставах бацькі змогуць набыць усё неабходнае да новага навучальнага года.**

У сталіцы з 11 па 21 жніўня ў Палацы мастацтваў (на вуліцы Казлова, 3) будзе адкрыта тэматычная выстава «Школьны базар ад «А» да «Я». 20-21 жніўня закупіць школьную форму і канцтавары мінчане змогуць на пляцоўцы каля Палаца спорту — там чакаецца агульнагарадскі кірмаш «Час у школу!». Міжнародныя спецыялізаваныя выставы будуць арганізаваны і ў цэнтры «БелЭкспа», з 24 па 31 жніўня.

Школьныя кірмашы запланаваны ў гэтым месяцы таксама ў Мінскай вобласці. 13 жніўня тэматычныя базары пройдуць у Барысаве і Жодзіне, 20-га — у Барысаве, Вілейцы, Любані, Маладзечне, Салігорску, Слуцку, 21-га — у Нясвіжы, 27-га — у Жодзіне і Вілейцы.

У Гродне спецыялізаваны кірмаш «Добры дзень, школа!» працуе да 4 верасня без выхадных. Свае тавары там прадстаўляюць 48 прадпрыемстваў.

Да 4 верасня дзейнічаюць пастаянныя кірмашы ў Гомелі: побач з цэнтральным рынкам і каля гандлёвага дома «Рэчыцкі». Кожныя выхадныя жніўня і 3-4 верасня гарадскія школьныя базары будуць арганізаваны таксама на плошчы Паўстання.


Фота Надзеі БУЖАН.

У Брэсце школьныя базары працуюць па вуліцы Гогаля кожныя выхадныя жніўня.

Магілёўскі спецыялізаваны кірмаш (знаходзіцца на пляцоўцы гандлёвага комплексу «Парк-Сіці») адкрыты штодзень да канца жніўня.

Базары для школьнікаў Віцебска запланаваны на 20 і 27 жніўня па вуліцы Леніна.

Усяго да навучальнага года плануецца правесці больш за дзве тысячы выстаў-продажаў для вучняў. Мерапрыемствы пройдуць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі і будуць суправаджацца забаўляльнымі праграмамі, конкурсамі для дзяцей, рэкламнымі акцыямі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

# ЖУРНАЛІСЦКАЯ ПРАЦА АЦЭНЕНА

**Спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» па Гомельскай вобласці Ірына АСТАШКЕВІЧ адна з узнагароджаных па выніках абласнога спаборніцтва сярод рэдакцый газет, арганізацый тэлебачання і радыё.**



Ад імя Гомельскага аблвыканкама начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі ўручыла ёй ганаровую грамату — за шматгадовую працу ў журналістыцы, усебаковае асвятленне ў друку сацыяльна-эканамічнага развіцця Гомельскай вобласці.

У намінацыі «Лепшая газета» дыплом I ступені — у абласной газеты «Гомельская праўда». Лепшым журналістам друкаванага выдання прызнаны ўласны карэспандэнт газеты «Беларускі час», старшыня Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч.

**Ул. кар.**

## Выратаваў на пажары траіх

**Амаль апоўначы капыльскім выратавальнікам паступіла паведамленне пра загаранне жылога дома ў вёсцы Садавічы. Калі падраздзяленні МНС прыбылі на месца выкліку, аднапавярховы драўляны жылы дом гарэў адкрытым полымем.**

Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, да прыезду пажарных сусед праз аконны праём выратаваў гаспадара дома, яго жонку і сына. Мужчына, які знаходзіўся ў гасцях, пры выхадзе з дома атрымаў апёкі. Яго шпіталізавалі. Згодна з папярэднімі звесткамі, напярэдадні пажару выратаваныя і пацярпелы знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. У выніку пажару агнём знішчаны дах, жыллё выгарала знутры. Прычына здарэння ўстанаўліваецца. Разглядаецца версія неасцярожнага абыходжання з агнём пры курэнні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Сістэма 3D-гуку ўжо ў Гродне

**У горадзе над Нёманам адбылася прэм'ера фільма «Атрад самазабойцаў» у новым фармаце 3D-гуку.**

Гродзенскі «Кастрычнік» стаў трэцім кінатэатрам у Беларусі, дзе ўсталявалі інавацыйную сістэму шматканальнага гуку Dolby Atmos.

— Мы стараемся ісці ў нагу з часам, каб нашы жыхары маглі глядзець кінафільмы з такой жа выдатнай якасцю гуку, як у Лондане, Парыжы ці Маскве, — зазначыў **генеральны дырэктар прадпрыемства «Гроднааблкінавідэапракат» Юрый АЛЯКСЕЙ.**

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества
**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62

**Продавец:** УП «Витебское отделение Белорусской железной дороги», г. Витебск, ул. Космонавтов, 10, тел. (0214) 45-62-12 (Локомотивное депо Полоцк)

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 3 года нежилого помещения площадью 65,7 кв.м, расположенного в капитальном строении с инв. №250/С-27224 по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Ленинградская, д. 58а (склад с рампой) для размещения складских помещений. Размер ежемесячной арендной платы: 14,78 базовой арендной величины. **Нач. цена** (с учетом/до деноминации) 223,38/2 233 800 руб. **Размер задатка** (с учетом/до деноминации): 22,34/223 400 руб.

Дата, время и место проведения аукциона: **06.09.2016 в 10.00** г. Полоцк, ул. Ленинградская, 64А в Локомотивном депо Полоцк. Срок внесения задатков и подачи документов: **с 08.08.2016 с 8.30 по 05.09.2016 до 17.30**

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на р/с организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. **Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, УНП 390477566. Конт. тел. (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

***Уважаемые акционеры ОАО «Элегант» !***

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**ОАО «Элегант»**
**СОСТОИТСЯ 16 августа 2016 года в 12.00,**
**регистрация акционеров с 11.00 по 11.45 по адресу: г. Жодино, пр-т Ленина, 22 ОАО «Элегант», бухгалтерия.**

УНН 600039318

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
**1. О сделках Общества.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен согласно реестру владельцев ценных бумаг эмитента по состоянию на 01 августа 2016 года.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: с 9 до 11 часов, начиная с 10.08.2016 г., по месту нахождения Общества.

Справки по тел. 8 (01775) 9 43 74.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**Организатор торгов**
**ООО «Юридическая группа «СОВЕТНИК» – управляющий по делу о банкротстве ООО «Корунд»**
**СООБЩАЕТ РЕЗУЛЬТАТЫ ТОРГОВ**
**по продаже имущества ООО «Корунд», которые состоялись 04 августа 2016 в 12.00 по адресу: г. Брест, ул. В. Хоружей, 8**

Проданы:
**ЗАО «ТехноКлип»** (ИНН 7825465909, адрес: 195030, РФ, г. Санкт-Петербург, ул. Химиков, д. 28)
**Станок заточной ВЗ-319,** 3 945,59 белорусского рубля, независимая оценка;
**Станок плоско-шлифовальный 1400А,** 6 904,17 белорусского рубля, независимая оценка;
**Станок токарно-винторезный 250 ИТВМ.01,** 3 106,85 белорусского рубля, независимая оценка;
**Станок фрезерный 67К25 ПФ2.0,** 2 416,47 белорусского рубля, независимая оценка;
**Станок фрезерный FP-2,** 3 204,18 белорусского рубля, независимая оценка.
Не продан:
**Станок ножовочный металлореж. Мп6-1697**, нет покупателя.

УНП 200228302

Утерянный представительством Белгосстраха по Ленинскому району г. Минска бланк страхового полиса квитанция о приеме денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ, серии КС № 4555982 **считать недействительным.** УНП 100122726

Утерянный бланк квитанции 1-СУ серии СВ № 0262007, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительным.**

УНП 101063229

■ Ну і ну!

## Паляваў на... в'етнамскіх свінак

**Інспектары Магілёўскай міжрайінспекцыі прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці двух жыхароў Клімавіч. Адным з іх быў сын мясцовага фермера, другім — яго прыяцель-паляўнічы.**

Апошні наладзіў стральбу з карабіна на полі каля вёскі Слабодка, каб здабыць... в'етнамскіх свінак, што пасвіліся там. Некалькі дзясяткаў гэтых жывёл каля месяца таму збеглі з загона фермерскай гаспадаркі, расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. І вось такім незвычайным чынам гаспадары вырашылі «вярнуць сваё». Дзеянні паляўнічага былі расцэнены як незаконныя, паколькі ніякіх дакументаў, якія б дазвалялі яму паляваць на гэтай тэрыторыі, мужчына не меў. Да таго ж зямлі згаданай гаспадаркі адначасова з'яўляюцца часткай паляўнічых угоддзяў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**